УДК 930:[94(438)+94(474.5)]

# ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРЫЧЫН ПАДПІСАННЯ ВІЛЕНСКА-РАДАМСКАЙ УНІІ 1401 г. ПАМІЖ КАРАЛЕЎСТВАМ ПОЛЬСКІМ І ВЯЛІКІМ КНЯСТВАМ ЛІТОЎСКІМ У ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ КАНЦА XIX–XX стст.

**Мікалаева Л. В.**
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі»
(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)

Анатацыя. У артыкуле даецца аналіз ключавых прац польскіх гісторыкаў, выдадзеных у канцы XIX–XX стст., у якіх закраналіся пытанні прычын падпісання Віленска-Радамскай уніі 1401 г. Робіцца высновa, што яны ўсебакова вывучаны і найбольш поўна раскрыты польскімі даследчыкамі.

Ключавыя словы: гістарыяграфія; знешняя палітыка; Вялікае Княства Літоўскае.

Summary. The article provides an analysis of key works by Polish historians published in the late XIX–XX-th centuries, which addressed the issues of the reasons for the signing of the Vilna-Radom Union in 1401. The conclusion is made that they were comprehensively studied and most fully disclosed by Polish researchers.

Key words: historiography; foreign policy; the Grand Duchy of Lithuania.

У агульным выглядзе праблематыка Віленска-Радамскай уніі 1401 г. закраналася ў амаль кожнай сур'ёзнай абагульняючай гістарычнай рабоце польскіх аўтараў канца XIX – XX стст. У сувязі з устаноўленымі абмежаваннямі аб'ёму ў дадзеным артыкуле былі прааналізаваны асноўныя творы, у якіх звярталася ўвага на прычыны Віленска-Радамскай уніі і якія дазволілі найбольш поўна раскрыць дадзеныя абставіны.

Мяркуем, можна пагадзіцца са сцвярджэннем, што Віленска-Радамская унія 1401 г. не адносіцца да найважнейшых падзей у гісторыі польска-літвінскіх адносін. Яна адыграла хутчэй эвалюцыйную, чым рэвалюцыйную ролю. Тым не менш, яна з'яўлялася важным звяном у двухбаковых адносінах дзяржаў як першы фармальны перагляд Крэўскай уніі 1385 г. Унія 1401 г. завяршыла пэўны этап у гісторыі польска-літвінскіх адносін і намеціла контуры іх далейшага развіцця.

Як вядома, Віленска-Радамская унія была заключана ў 1401 г. Яе рэгулявалі наступныя дакументы: акт Вітаўта ад 18 студзеня 1401 г., а таксама акт біскупаў, князёў і баяр ВКЛ ад таго ж дня, выдадзеныя ў Вільні, і акт польскай каралеўскай рады, выстаўлены ў Радаме 11 сакавіка таго ж года. Прынцыповымі рашэннямі уніі сталі: прызнанне Польшчай дзяржаўнай асобнасці Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ), выбары польскага караля з удзелам баяр-шляхты ВКЛ і абарончы саюз паміж дзяржавамі. Новым момантам быў удзел грамадскага фактару, альбо пашырэнне грамадскіх асноў уніі, а таксама больш дакладнае урэгуляванне

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўзаемных стасункаў караля Уладзіслава II Ягайлы і князя Вітаўта [1, s. 33–41].

У польскай гістарыяграфіі адзначана дыскусія па пытанні правамернасці выкарыстання тэрміна «унія» ў дачыненні да польска-літвінскіх дамоўленасцей 1401 г. Частка даследчыкаў сцвярджала, што Віленска-Радамская дамова была першай «сапраўднай» уніяй, у адрозненне ад Крэўскай уніі [10, s. 481, 494–495; 11, s. 22; 12, s. 21–22]. Апошняя, як інкарпарацыя, на думку гэтых гісторыкаў, не магла быць прызнана уніяй [4, s. 196–197, 243]. У сваю чаргу іншыя даследчыкі наогул адмаўлялі ўжыванне тэрміна «унія» ў дачыненні да польска-літоўскіх дамоваў 1401 г. Падобную пазіцыю займаў Я. Якубоўскі, які абгрунтоўваў яе тым, пагадненне 1401 г. не было заключана паміж двума народамі, а толькі рэгулявала адносіны паміж польскім каралём і вялікім князем літоўскім [8, s. 155]. О. Бальцэр, у сваю чаргу, спасылаўся на дзве прычыны, якія перашкаджалі выкарыстанню дэфініцыі «унія»: існаванне двух манархаў – караля і вялікага князя, а таксама няроўнасць абедзвюх дзяржаў: Польшчы і ВКЛ [2, s. 89–90]. Тым не менш, гэты даследчык пагадзіўся, што канвенцыйна все польска-літвінскія дамовы 1385–1569 гг. можна называць «уніямі», паводле старой моўнай традыцыі.

У айчыннай гістарычнай літаратуры XIX – пачатку XX стст. увага звярталася ў асноўным на адну прычыну Віленска-Радамскай уніі. Гаворка ішла аб паразе Вітаўта ў бітве на Ворскле ў 1399 г., што павінна было выклікаць аслабленне яго пазіцый. Сцвярджалася, што ў гэтай сітуацыі Польшча прымусіла Вітаўта і ВКЛ прыняць выгадныя для сябе і невыгодныя для ВКЛ рашэнні.

У польскай жа гістарыяграфіі ўжо тады абазначыўся адыход ад такой аднабаковасці. Так, у пачатку XX ст. С. Кутшэба заявіў, што сувязь паразы Вітаўта з генезісам уніі «часткова слушная» [10, s. 482]. Бо гэта параза вымусіла Вітаўта да змены яго знешняй палітыкі: пераарыентацыі яе прыярытэтаў з адносін з Тэўтонскім ордэнам на стасункі з Польшчай. Аднак гэты даследчык прызнаў, што генезіс уніі 1401 г. быў больш складаным, і пагадненне было дасягнута, дзякуючы кампрамісу паміж рознымі бакамі: палякамі, літвінамі, Уладзіславам II Ягайлам і Вітаўтам.

У сваю чаргу Л. Калянкоўскі ацаніў традыцыйныя погляды пра выкарыстанне Польшчай аслаблення ВКЛ у 1401 г. і заявіў, што такая інтэрпрэтацыя «не мае ніякага абгрунтавання» [9, s. 74]. Яна заснавана на памылковай пасылцы: альбо на тым, што Вітаўт быў вялікім князем літоўскім з 1392 г., што няправільна, альбо на тым, што паміж польскім каралём і вялікім князем літоўскім існавалі прынцыповыя разыходжанні ў палітыцы. Апошнюю падставу Л. Калянкоўскі раскрытыкаваў і прызнаў, што «ўсходняя палітыка ў рэчаіснасці была палітыкай Ягайлы». Таму параза на Ворскле была пройгрышам і Уладзіслава II Ягайлы, і Вітаўта. Гэта ж вымусіла да перагляду іх усходняй палітыкі і адносінаў да Тэўтонскага ордэна, вынікам чаго была Віленска-Радамская унія. Як бачна з гэтай інтэрпрэтацыі, тут наогул не было гаворкі пра які-небудзь ціск палякаў на літвінаў. Роля ж паразы на Ворскле, хаця і важная ў генезісе уніі, заключалася зусім у іншым, а менавіта: у пераглядзе знешняй палітыкі Польшчы і ВКЛ на ўсходнім і тэўтонскім кірунках.

Тут належыць звярнуцца да тэзіса аб тым, што параза на Ворскле аслабіла становішча Вітаўта і ВКЛ адносна Польшчы. Гэта слушнае сцвярджэнне было ўдакладнена польскімі гісторыкамі. Так, О. Халецкі адзначыў, што, па-першае, параза Вітаўта была кароткачасовай і не працягнулася даўжэй за некалькі месяцаў пасля жніўня 1399 г. Па-другое, не трэба перабольшваць наступствы паразы на Ворскле для Вітаўта і ВКЛ [6, s. 159]. У рэшце рэшт, яны абмежаваліся спусташэннем татарамі Кіева-Валынскага памежжа, а ва ўнутраных абласцях становішча Вітаўта пасля яе нават умацавалася з-за гібелі цэлага шэрагу князёў, чые ўдзелы перайшлі пад яго непасрэдную ўладу, напрыклад, Бранск Дзмітрыя Альгердавіча. Па-трэцяе, Вітаўта хутка вярнуўся да мінулай актыўнасці ва ўнутранай і знешняй палітыцы. Такім чынам, даследчык канстатаваў, што параза на Ворскле ў жніўні 1399 г. не мела істотнага ўплыву на Віленска-Радамскую унію ў пачатку 1401 г. З гэтым меркаваннем у канцы XX ст. пагадзіўся Ю. Бардах, які сцвярджаў, што тут хутчэй трэба казаць пра ўскосныя, а не прамыя наступствы гэтай паразы для уніі [3, s. 12]. Яе роля заключалася перш за ўсё ў тым, што яна падштурхнула Вітаўта да пераарыентацыі сваёй знешняй палітыкі. Ён меў у той час дзве альтэрнатывы: правядзенне пратэўтонскай альбо прапольскай лініі. Як вядома, пасля пэўных ваганняў Вітаўт выбраў польскі варыянт – на карысць уніі.

Заканамерна паўстае прынцыповае пытанне: «Чаму так адбылося?» Некаторыя даследчыкі наогул пісалі пра пэўны аўтаматызм, што Вітаўт пасля паразы на Ворскле «зменшыў тон», быў вымушаны шукаць пагаднення з палякамі [13, s. 68]. «Параза на Ворскле, – пісаў Х. Лаўмяньскі, – канчаткова перакапала Вітаўта ў шкоднасці намеру разрыву з Польшчай» [14, s. 49]. Гэта лапідарнае меркаванне, зрэшты, не новае [10, s. 482], добра адлюстроўвала сутнасць справы. Бо Вітаўт зразумеў неабходнасць падтрымання добрых адносін з Польшчай, усвядоміў, што іх разрыў не прывядзе ні да чаго добрага. У выніку ён стаў больш схільны да кампрамісу з палякамі.

Гэтыя меркаванні некалькі перабольшаны. Тым не менш, верагодна, слушным з'яўляецца сцвярджэнне, што саюз з крыжакамі пасля Ворсклы «адразу страціў значэнне» для ВКЛ [5, s. 207; 13, s. 68]. У прыватнасці, гаворка ішла пра тое, што коштам гэтага міру была Жамойць. Пасля паразы на Ворскле аказалася, што перадача Жамойці ордэну станавілася «непатрэбнай ахвярай», якая не прынесла ВКЛ ніякай карысці. У той сітуацыі Вітаўт выбраў польскі варыянт, які прынёс яму больш выгады. Ён дазваляў рэалізаваць наступныя мэты: адабраць Жамойць у крыжакоў, што патрабавала ваеннай дапамогі ад Польшчы, а таксама знайсці такую форму польска-літвінскай уніі, якая была б прымальнай для Вітаўта і літвінаў.

Яшчэ адной прычынай Віленска-Радамскай уніі называюць смерць каралевы Ядвігі. Гэта падзея выклікала крах Крэўскай мадэлі уніі. Нагадаем, что ў яе аснове было стварэнне Каралеўства Польскага (з ВКЛ у яго складзе), якім павінны былі кіраваць нашчадкі Ядвігі і Уладзіслава II Ягайлы. Смерць каралевы знішчыла гэтыя планы. Дынастычны надзеі Ягайлы, здавалася, зніклі. Больш за тое, ён і сам праяўляў сумненні ў тым, што пасля смерці жонкі ў яго яшчэ ёсць правa на польскі трон. Нібы баючыся, што яго могуць «выкінуць» з Польскага Каралеўства, ён накіраваўся назад у ВКЛ. Такі варыянт быў вельмі небяспечны для Вітаўта, паколькі, калі б Ягайла вярнуўся на сваю пазіцыю, якая існавала да 1386 г., то любы іншы Гедымінавіч ужо не мог бы ажыццяўляць вялікакняжацкую ўладу.

Але такі падыход быў не менш небяспечны для уніі, якая развалілася б пасля смерці Ядвігі, паколькі Ягайла, як вялікі князь літоўскі, ужо ніяк не мог падпарадкавацца новаму польскаму каралю. Таму складалася ўражанне, што яго рашэнне адмовіцца ад польскага прастола было толькі майстэрскім і, як хутка высветлілася, эфектыўным манеўрам, каб атрымаць ад палякаў тое, да чаго ён імкнуўся з самага пачатку: спадчыннае права на Польскае Каралеўства. Фактычна яно было прадстаўлена яму ў выглядзе новага абрання, якое было ўжо не толькі яго персанальным абраннем, як у 1386 г., а выбарам новай спадчыннай дынастыі. Новая магчымасць атрымання нашчадкаў і адначасова замацаванне гэтых спадчынных правоў павінны былі быць забяспечаны яго новым шлюбам з унучкай караля Казіміра Вялікага Ганнай Цылейскай.

У выніку была цалкам адноўлена сітуацыя 1386 г., толькі дынастычныя імкненні караля Уладзіслава II Ягайлы былі лепш забяспечаны. Але дзяржаўна-прававыя адносіны ВКЛ з Польшчай таксама мелі патрэбу ва ўдакладненні [6, s. 158–161]. Адкрытым пытаннем заставалася форма будучага саюза. На гэта ўплывала шмат фактараў. Перш за ўсё, вопыт, які быў вынікам 15 гадоў існавання уніі (1385–1400 гг), а таксама: пазіцыя Вітаўта, адносіны паноў і баяр ВКЛ, практычная немагчымасць інкарпарацыі ВКЛ у Польшчу, пазіцыя польскага караля, паноў і польскай шляхты, выбух сепаратызму ВКЛ у 1398 г. у Саліне, а таксама роля князя Свідрыгайлы.

На мяжы XIX–XX ст. у польскай гістарыяграфіі была звернута ўвага на тое, што, акрамя паразы на Ворскле, на збліжэнне Вітаўта з Польшчай таксама ўплывала варожая пазіцыя князя



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Свідрыгайлы. Гэту думку развіў О. Халецкі, які меркаваў, што ўласна непакой Вітаўта аб тым, што Свідрыгайла будзе ўзведзены палякамі на трон ВКЛ, канчаткова схіліў яго да кампрамісу з апошнімі ў 1401 г. [6, s. 160–161]. Гэты даследчык наогул лічыў згаданую прычыну больш важнай, чым параза на Ворскле [6, s. 159].

У частцы літаратуры высоўвалася гіпотэза ці наогул сцвярджалася, што палякі імкнуліся супрацьпаставіць Свідрыгайлу Вітаўту. Дастаткова ў агульных рысах і загадкава на гэту тэму пісаў О. Халецкі, сцвярджаючы, што Вітаўт непакоіўся адносна падтрымкі Свідрыгайлы палякамі [6, s. 160–161]. Матыў такіх паводзін быў відавочны – гаворка ішла пра запалохванне Вітаўта, каб мець над ім які-небудзь кантроль. Ацэньваючы гэта меркаванне, яго нельга канчаткова ні адхіліць, ні прыняць. Аднак трэба дадаць, што супрацьпастаўленне Вітаўта і Свідрыгайлы было не толькі ў інтарэсах палякаў, але і самога польскага караля. Напэўна, нават больш верагодным было б меркаванне, што гэта кароль Уладзіслаў ІІ Ягайла маніпуляваў братамі ў барацьбе за ўладу ў ВКЛ.

Такім чынам, у роздумах пра генезіс Віленска-Радамскай уніі часцей указвалася толькі адна прычына – аслабленне Вітаўта пасля паразы на Ворскле. Аднак даследаванні польскіх вучоных дазволілі змяніць пункт гледжання ў дадзеным пытанні, прапанаўшы таксама версію суперніцтва Свідрыгайлы і дадаўшы слушныя заўвагі пра крах Крэўскай мадэлі уніі. У рэчаіснасці на генезіс гэтай дамовы мелі ўплыў усе згаданыя фактары. Хаця іх роля не была аднолькавай. Тым не менш, прычыны Віленска-Радамскай уніі былі комплексна даследаваны польскімі гісторыкамі і найбольш поўна раскрыты.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Akta unii Polski z Litwą. 1385–1791 / wyd. S. Kutrzeba i W. Semkowicz. – Krakow : Skład głowny w księgarni Gebethnera i Wolffa, 1932. – 633 s.
2. Balzer, O. Nowsze poglądy na istotę prawno-panstwowego stosunku Polski i Litwy w jagiellonskim sredniowieczu / O. Balzer // Sprawozdania Towarzystwa naukowego we Lwowie. – 1921. – R. 1. – Z. 1. – S. 81–94.
3. Bardach, J. O Rzeczpospolitą Obojga Narodow / J. Bardach. – Warszawa : Krajowa Agencja Wydawnicza, 1998. – 72 s.
4. Błaszczyk, G. Dzieje stosunkow polsko-litewskich od czasow najdawniejszych do społczesnosci: w 2 t. / G. Błaszczyk. – Poznan : Wydawnictwo Poznanskie, 1998 – 2007. – T. I. Trudne początki. – 1998. – 366 s.
5. Boockmann, H. Zakon Krzyzacki. Dwanascie rozdziałow jego historii / H. Boockmann. – Warszawa : *«Volumen» : NIH*, 1998. – 396 s.
6. Halecki, O. Dzieje Unii Jagiellonskiej/ O. Halecki. – Krakow : Akademia Umiejętnosci, 1919–1920. – T. 1. – 1919. – 482 s.
7. Halecki, O. Wcielenie i wznowienie panstwa litewskiego przez Polskę (1386–1401) / O. Halecki // Przegląd Historyczny. – Serya II. – 1917–1918. – T. XXI. – S. 1–77.
8. Jakubowski, J. Z zagadnien unii polsko-litewskiej / J. Jakubowski // Przegląd Historyczny. – Serya II. – 1919–1920. – T. XXII. – S. 136–155.
9. Kolankowski, L. Dzieje Wielkiego księstwa Litewskiego za Jagiellonow / L. Kolankowski. – Warszawa : Scład głowny: kasa im. Mianowskiego, 1930. – T. 1 (1377–1499). – 475 s.
10. Kutrzeba, S. Unia Polski z Litwą / S. Kutrzeba // Polska i Litwa w dziejowym stosunku. – Krakow etc. : Gebethner i Wolff, 1914. – S. 449–658.
11. Lewicki, A. Nieco o unii Litwy z Koroną / A. Lewicki. – Krakow : Nakładem Autora w Drukarni «Czasu», 1893. – 48 s.
12. Lewicki, A. Powstanie Swidrygiełły : ustęp z dziejow unii Litwy z Koroną / A. Lewicki. – Krakow : Nakładem Akademii Umiejetnosci, 1892. – 389 s.
13. Łowmianski, H. Polityka Jagiellonow / H. Łowmianski; do druku przyg. K. Pietkiewicz. – Poznan : Wydawnictwo Poznanskie, 1999. – 673 s.
14. Łowmianski, H. Witold wielki książę litewski / H. Łowmianski. – Wilno : Wydawnictwo Komitetu Obchodu Pięcsetnej Rocznicy Zgonu Wielkiego Księcia Witolda, 1930 – 121, [2] s.